Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

29 КАСТРЫЧНІКА 2013 г. АЎТОРАК № 204 (27569) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

РАМАНТЫКА ТВОРЧАГА ПОШУКУ

Дарагія сябры!

Віншую вас са знамянальнай датай у гісторыі маладзёжнага руху — 95-годдзем ВЛКСМ.

Для многіх нашых суайчыннікаў назаўсёды застануцца ў памяці гады камсамольскага юнацтва, авеяныя рамантыкай творчых пошукаў, энтузіязмам стваральнай працы і імкненнем будаваць сучаснасць і будучыню сваёй Радзімы.

Гістарычны шлях Саюза моладзі адзначаны яркімі здзяйсненнямі ў перыяд будаўніцтва прамысловых гігантаў першых пяцігодак, гераізмам на франтах Вялікай Айчыннай вайны, актыўным удзелам у аднаўленні разбураных гарадоў і вёсак, асваенні цаліны, раёнаў Крайняй Поўначы, Далёкага Усходу і Сібіры.

У нашай краіне цудоўныя традыцыі камсамольскага руху прадаўжае Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі. Гэта масавая грамадская арганізацыя, прыцягваючы ў свае рады лепшых прадстаўнікоў маладога пакалення, становіцца для іх добрай школай выхавання грамадзянскай адказнасці, ініцыятарам добрых пачынанняў і выразнікам інтарэсаў усіх юнакоў і дзяўчат.

Паважаныя ветэраны камсамола! Шчыра ўдзячны вам за захаванне пераемнасці і за дабратворны ўплыў, які вы аказваеце на моладзь. Няхай гэты юбілей стане значнай вяхой ва ўмацаванні нашага маладзёжнага руху, прымнажэнні яго слаўных спраў. Жадаю вам здароўя, аптымізму, шчасця, творчай энергіі і новых перамог у імя працвітання роднай Беларусі.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

ЗАЦІКАЎЛЕНАСЦЬ У КАНСТРУКТЫЎНЫМ СУПРАЦОЎНІЦТВЕ

План сумесных дзеянняў урада і Нацбанка па структурным рэфармаванні і павышэнні канкурэнтаздольнасці эканомікі Беларусі, зацверджаны ў кастрычніку гэтага года, можа стаць асновай для новай праграмы Міжнароднага валютнага фонду (МВФ) з Беларуссю. Такое меркаванне выказаў прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч на сустрэчы з кіраўніком місіі МВФ у Беларусі Дэвідам Хофманам, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

Прэм'ер-міністр прапанаваў кіраўніку місіі разгледзець механізм вырашэння двух даволі важных пытанняў, такіх як плацежны баланс і рэзервы. «Гэта значыць, на якія крокі фонду можа разлічваць Беларусь у рамках пятага артыкула статута МВФ, згодна з якім кожная дзяржава — удзельнік фонду можа разлічваць на атрыманне дапамогі ў вырашэнні праблем плацежнага балансу і рэзерваў. Прычым на прынцыпах недыскрымінацыйнасці», — удакладніў ён. Паводле слоў кіраўніка беларускага ўрада, цяпер у эканоміцы Беларусі менавіта такая сітуацыя, калі актуальны разгляд сумесных мер у рамках гэтага артыкула статута.

У цэлым Міхаіл Мясніковіч адзначыў, што ўрад зацікаўлены ў канструктыўным супрацоўніцтве з фондам.

«Калі гаварыць аб некаторых пытаннях развіцця беларускай эканомікі на сучасным этапе, то мы прытрымліваемся той матрыцы, якая была адпрацавана з Антыкрызісным фондам ЕўрАзЭС. Гэта была наша ўзаемная дамоўленасць з Расіяй і Казахстанам, і мы імкнёмся дзейнічаць у рамках тых параметраў, якія былі вызначаны адпаведнай праграмай з АКФ», — падкрэсліў прэм'ер-міністр.

Акрамя таго, дадаў ён, урад і Нацыянальны банк Беларусі прынялі план сістэмных і структурных пераўтварэнняў, які быў прадстаўлены місіі. «На наш погляд, гэта тая база, на аснове якой могуць будавацца падыходы па новай праграме МВФ з Беларуссю», — лічыць Міхаіл Мясніковіч.

Беларусь рэалізавала праграму стэнд-бай, падтрыманую крэдытам МВФ на $3,5 млрд, у перыяд са студзеня 2009 па красавік 2010 года. Гэта дало магчымасць краіне забяспечыць дадатную дынаміку па шэрагу пазіцый у эканоміцы і грашова-крэдытнай сферы. На 2013 год прыпадае пік выплат па крэдыце. З 17 па 28 красавіка ў Мінску знаходзіцца місія супрацоўнікаў Міжнароднага валютнага фонду, якую ўзначальвае Дэвід Хофман, для правядзення пятага постпраграмнага маніторынгу беларускай эканомікі.

Міжнародны валютны фонд — спецыялізаваная ўстанова ААН са штаб-кватэрай у Вашынгтоне (ЗША). Афіцыйная дата стварэння МВФ — 27 снежня 1945 года. Беларусь з'яўляецца членам МВФ з 1992 года. Дзейнасць МВФ у Беларусі накіравана на супрацоўніцтва з урадам і Нацыянальным банкам пры падрыхтоўцы праграм эканамічнай палітыкі з акцэнтам на падаткова-бюджэтную і грашова-крэдытную палітыку, абменны курс і гандлёвую палітыку з мэтай дасягнення значнага эканамічнага росту, нізкай інфляцыі і ўстойлівасці плацежнага балансу.

З 1992 па 2008 год Беларусь двойчы выкарыстоўвала фінансавыя рэсурсы МВФ: па лініі фонду сістэмных трансфармацый — $217,2 млн і па механізме стэнд-бай — $77,4 млн. У лютым 2005 года Беларусь цалкам пагасіла названыя крэдыты МВФ.

КАНІКУЛЫ ПА ІНТАРЭСАХ

Фота БЕЛТА.

Вольны час школьнікаў у канікулярны час уключае розныя формы адукацыйнай, творчай, спартыўнай, працоўнай, прафарыентацыйнай дзейнасці. У перыяд восеньскіх канікул у Цэнтры дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі «Ранак» Маскоўскага раёна Мінска працуюць розныя аб'яднанні па інтарэсах, праводзяцца пазнавальныя, забаўляльныя і конкурсныя мерапрыемствы для гарадскіх аздараўленчых лагераў. Арганізаваны экскурсіі ў музеі Цэнтра. 500 хлопчыкаў і дзяўчынак пабываюць у музеі баявой славы і музеі гісторыі пажарнай справы «Скрозь полымя гадоў». У цэнтры працуюць 512 гурткоў. У перыяд канікул арганізавана праца гарадскога аздараўленчага лагера для навучэнцаў Цэнтра.

ЛІЧБА ДНЯ

9 млн 465,5 тыс. чалавек

склала колькасць насельніцтва Беларусі на 1 кастрычніка гэтага года. Натуральнае змяншэнне насельніцтва сёлета ў студзені—верасні знізілася ў параўнанні з адпаведным перыядам 2012 года на 28% і склала 6 тыс. 247 чалавек. Міграцыйны прырост за студзень—верасень склаў 7 тыс. 869 чалавек (узрос у параўнанні з аналагічным перыядам 2012 года на 1 тыс. 750 чалавек, або на 28,6 %) і кампенсаваў натуральнае змяншэнне насельніцтва, забяспечыўшы павелічэнне яго колькасці. Паводле аператыўных даных, у студзені—верасні гэтага года ў рэспубліцы нарадзілася 87 тыс. 917 дзяцей, памерлі — 94 тыс. 164 чалавекі.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 29.10.2013 г.

Долар ЗША	9180,00	▲
Еўра	12670,00	■
Рас. руб.	288,50	▼
Укр. грыўня	1121,56	▼

■ Надвор'е

З СЕРАДЫ ПАЧНЕ СВЯЖЭЦЬ...

У аўторак на тэрыторыі нашай краіны захаваецца цёплае надвор'е, калі пры павышаным атмасферным ціску дажджоў не прадбачыцца, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга Фядотава.

Разам з тым месцамі чакаецца узмацненне паўднёва-заходняга ветру, у паўночных рэгіёнах краіны парывамі да 15-18 м/с. Максімальная тэмпература паветра ўдзень 12-17 цяпла, у Брэсцкай і Гомельскай абласцях — да плюс 19 градусаў. Аднак ужо ў сераду атмасферныя франты прынясуць кароткачасовыя дажджы ўначы ў паўднёва-заходнія раёны, а ўдзень — і ў паўднёва-ўсходнюю палову Беларусі. Раніцай і ўначы слабы туман. Пасвяжэе. Тэмпература паветра ўначы на сераду плюс 4-10 градусаў (толькі па поўдні да плюс 12), удзень 8-14 цяпла.

У апошні дзень месяца атмасферны ціск будзе павялічвацца, таму істотных ападкаў ужо не будзе. Толькі ўначы па паўднёвым ўсходзе кароткачасовыя дажджы. Раніцай і ўначы ў асобных раёнах туман. Уначы на чацвер тэмпература паветра знізіцца да плюс 2-8 градусаў, удзень — 7-13 цяпла. Не прагназуецца істотных ападкаў і ў пятніцу. Раніцай месцамі туман. Тэмпература ўначы стане ўжо ад 0 да плюс 6 градусаў, удзень — 7-13 цяпла.

Сяргей КУРКАЧ.

■ Фінансавая «навінка»

РУБЛЁВЫ ДЭПАЗІТ «ПРЫВЯЗАЛІ» ДА ВАЛЮТЫ

Упершыню буйнейшы банк Беларусі прапануе насельніцтву эксклюзіўны фінансавы прадукт — уклад у беларускіх рублях «Гарант», які забяспечвае стабільны ўзровень даходнасці, незалежна ад змены курсу долара, паведамілі рэдакцыі ў прэс-службе Беларусбанка.

Такім чынам, даход па ўкладзе «Гарант» складаецца з асноўнага даходу — працэнтнай стаўкі ў памеры 10, 12 ці 15%, а таксама дадатковага даходу, які ўсталёўваецца ў працэнтах гадавых у залежнасці ад змены курсу долара.

Асноўны даход можа выплачвацца як штомесяц, так і ў канцы тэрміну. Дадатковы даход выплачваецца пры надыходзе тэрміну вяртання ўкладу. Уклад можа быць адкрыты на любы тэрмін па вашым выбары — 3, 6 ці 12 месяцаў. Уклад не прадугледжвае расходныя аперацыі і дадатковыя ўзносы. Мінімальная сума ўкладу складае 10 млн рублёў.

Пры размяшчэнні сродкаў у беларускіх рублях банк гарантуе кліентам атрыманне дадатковага даходу, які забяспечыць вяртанне ўкладзеных збераж энняў у беларускіх рублях, эквівалентных суме долараў на дату адкрыцця ўкладу, плюс асноўны працэнтны даход.

Сяргей КУРКАЧ.

САЮЗНЫ ТУРНІР ІНТЭЛЕКТУАЛАЎ

Заключны этап алімпіяды школьнікаў Саюзнай дзяржавы «Расія і Беларусь»: гістарычнае і духоўнае адзінства» стартаваў у Полацку 27 кастрычніка.

Удзел у заключным туры алімпіяды возьмуць 180 беларускіх і расійскіх школьнікаў — вучні 9—11-х класаў. Беларусь прадставяць 8 каманд — з усіх абласцей, сталіцы, і асобная каманда — з Ліцэя БДУ. У кожную каманду ўваходзіць 6 чалавек.

Заключны этап алімпіяды складаецца з двух тураў — асноўнага і творчага. Асноўны тур — абавязковы для ўсіх удзельнікаў. Падчас гэтага тура школьнікі выконваюць пісьмовыя заданні: пішуць сачыненне і комплексную работу па рускай мове і літаратуры. Ахвотныя могуць прыняць удзел яшчэ і ў творчым туры, дзе вызначаюцца пераможцы ў рытарычным майстэрстве, выразным чытанні, а таксама знаўцы гісторыі. Ацэньваць здольнасці школьнікаў будзе журы, у склад якога ўвайшлі вядомыя беларускія і расійскія навукоўцы, вядучыя выкладчыкі ВНУ і настаўнікі-практыкі. Таксама для ўдзельнікаў алімпіяды запланавана вялікая культурная і экскурсійная праграма.

Пераможцаў алімпіяды чакаюць спецыяльныя дыпломы, каштоўныя прызы і падарункі. Астатнія школьнікі атрымаюць дыпломы ўдзельнікаў і сувеніры. Таксама плануецца выдаць зборнік лепшых работ.

Фота БЕЛТА.

Алімпіяда школьнікаў «Расія і Беларусь: гістарычнае і духоўнае адзінства» праводзіцца з 2004 года. Яе арганізатары — Міністэрства адукацыі нашай краіны і Міністэрства адукацыі і навукі Расійскай Федэрацыі. Фінансаванне ажыццяўляецца з бюджэту Саюзнай дзяржавы.

Беларускія школьнікі, якія перамагаюць на алімпіядзе, атрымліваюць права прыярытэтнага паступлення на філалагічныя спецыяльнасці ў расійскія і беларускія ВНУ. У 2012 годзе абсалютным пераможцам алімпіяды «Беларусь—Расія: гістарычная і духоўная еднасць» стала навучэнка гомельскай гімназіі № 14 Вольга Нянашава, якая набрала максімальную колькасць балаў, значна апярэдзіўшы ўсіх удзельнікаў.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ДОБРАЕ МЕСЦА НА ВОСЕНЬ ЖЫЦЦЯ

Ці хутка беларускія пенсіянеры змогуць жыць на камфортных і ўтульных «вілах»?

Большасць сем'яў імкнуцца самі клапаціцца пра сваіх састарэлых бацькоў. Але, пакідаючы іх адных дома, пакуль самі знаходзяцца на працы, трывожацца: як там яны адны? Ці змогуць падагрэць абед, ці не забудуць выключыць пліту? Для часткі з іх праблема цяпер вырашана: учора ў Мінску ў Фрунзенскім раёне адкрылася першае аддзяленне дзённага знаходжання для пажылых. Цяпер старых бацькоў можна будзе пакінуць там, як у дзіцячым садку, а ўвечары забраць дадому.

Дзеці на працу, а пажылыя бацькі — у «дзіцячы сад»

— У аддзяленне мы будзем браць людзей пенсійнага ўзросту, тых, хто мае патрэбу ў доглядзе і па стане здароўя не можа знаходзіцца дома адзін, — кажа **намеснік старшыні камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Ірына ДУДКА**. — Іх дзеці, як правіла, працуюць. І для таго, каб яны не былі вымушаны змяшчаць бацькоў у дом-інтэрнат альбо кідаць працу, каб пажылы чалавек жыў побач са сваякамі, у родных сценах, і ствараюцца такія аддзяленні.

СТАР. 3

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ГРУЗІЯ АБРАЛА ПРЭЗІДЭНТА



Кандыдат ад кіруючай кааліцыі «Грузінская мара» Георгій Маргвелашвілі перамог на выбарах прэзідэнта Грузіі. Па выніках падліку 99,68 працэнта бюлетэняў ён набраў 62,12 працэнта галасоў выбаршчыкаў. Як паведаміла прэс-сакратар ЦВК Грузіі Эка Азарашвілі, гэта практычна канчатковыя звесткі, і нічога ўжо не зменіцца. Бліжэйшыя апаненты Маргвелашвілі — кандыдат ад партыі Міхаіла Саакашвілі «Адзіны нацыянальны рух» Давід Бакрадзэ і былы спікер парламента Ніно Бурджанадзэ набралі 21,72 і 10,18 працэнта галасоў адпаведна. Яўка на выбарах склала 46,91 працэнта. Паводле звестак прэс-сакратара Цэнтрвыбаркама, сур'ёзных парушэнняў падчас галасавання зафіксавана не было. Усяго за прэзідэнцкае крэсла змагаліся 23 чалавекі.

ЗЛУЧАНЫЯ ШТАТЫ ПАЧЫНАЮЦЬ УСТАЛЁЎВАЦЬ СІСТЭМУ ПРА Ў РУМЫНІІ

На базе ў Дэвеселу на поўдні Румыніі ў панядзелак стартавалі работы па размяшчэнні супрацьракетнага комплексу як часткі створанай Злучанымі Штатамі і НАТА еўрапейскай супрацьракетнай абароны. Для ўдзелу ў цырымоніі пачатку разгортвання сістэмы ПРА ў Румынію прыбылі намеснік міністра абароны ЗША па палітычных справах Джэймс Мілер і шэраг высокапастаўленых прадстаўнікоў краін — членаў НАТА. Расія тым часам зноў заклікала Злучаныя Штаты і НАТА паспрабаваць разам выйсці з тупіка ў сувязі з абмеркаваннем праблемы ПРА, якая з'яўляецца ключавой у росце напружанасці ў адносінах паміж Масквой і Вашынгтонам. Але ў той жа час Маскву не задавальняюць толькі размовы ЗША і НАТА аб ненакіраванасці еўрапейскай ПРА супраць Расіі. Гэтую тэму падняў у панядзелак міністр замежных спраў РФ Сяргей Лаўроў, выступаючы на 8-м пасяджэнні расійска-ўкраінскага падкамітэта па міжнародным супрацоўніцтве.

АМЕРЫКАНЕЦ НЕ ЗМОГ АДМЯНІЦЬ РАШЭННЕ СУДА АБ СВАЁЙ СМЕРЦІ

У штаце Агаё мужчына, які звярнуўся ў суд з патрабаваннем адмяніць пастанову аб сваёй смерці, застаўся юрыдычна «мёртвым». Суддзя акругі Хэнкок Алан Дэвіс, які абвясціў Дональда Юджына Мілера-малодшага мёртвым у 1994 годзе пасля таго, як той восем гадоў лічыўся без вестак прапаўшым, аб'явіў, што тэрмін даўнасці для адмены гэтага рашэння даўно мінуў. Ён адзначыў, што, згодна з законам штата, пастанову аб смерці можна адмяніць толькі на працягу трох гадоў пасля яе прыняцця. Паводле слоў Мілера, ён уцёк з дому 27 гадоў таму з-за таго, што шмат піў і страціў працу. Мёртвым яго аб'явілі па звароце яго былой жонкі Робін. За восем гадоў сваёй адсутнасці ён не выплачваў аліменты, і такім чынам яна збіралася дамагчыся права на сацыяльную дапамогу для дзяцей.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

«СВЯТЫ ІУДА» АБРЫНУЎСЯ НА ВЯЛІКАБРЫТАНІЮ, НІДЭРЛАНДЫ І ФРАНЦЫЮ

Магутны ўраган, які атрымаў імя святога Іуды, абрынуўся ўчора раніцай на паўднёвыя раёны Вялікабрытаніі, а таксама на паўночны захад Францыі, перадаюць інфармагенцтвы. Хуткасць ветру на ўзбярэжжы Паўднёвай Англіі дасягала 120 км/г. У шэрагу рэгіёнаў перакрыты аўтамабільныя дарогі, на маршруты не выйшлі цягнікі. У лонданскім аэрапорце Хітроў адменены сотні рэйсаў. У Лондане будаўнічы кран упаў на будынак сакратарыята кабінета міністраў у Вестмінстары. Ураган ужо стаў прычынай гібелі прынамсі трох чалавек. У Вялікабрытаніі 17-гадовая жыхарка Эдэнбрыджа атрымала смяротныя раненні пасля таго, як на яе ўпала дрэва. Мужчына, якому было за 50 гадоў, загінуў за рулём свайго аўтамабіля ў Хартфордшыры таксама падчас падзення дрэва, перадае BBC.

Раней таксама стала вядома аб яшчэ адной ахвяры — 14-гадовым падлетку, якога, як мяркуецца, знесла ў мора ў мястэчку Ньюхевэн. Выратавальныя службы спрабавалі адшукаць юнака сярод хваль, але былі вымушаны адступіць, калі шторм узмацніўся. У Нідэрландах «Святы Іуда» забраў жыццё жыхаркі Амстэрдама, паведамляе агенцтва Reuters са спасылкай на прадстаўнікоў мясцовай паліцыі. На жанчыну ўпала паваленае ветрам дрэва. Яе муж, які знаходзіўся побач, дастаўлены ў бальніцу з сур'ёзнай траўмай галавы. Сіноптыкі прагназуюць, што «Святы Іуда» можа стаць самым разбуральным у Еўропе за апошнія 20 гадоў.

КОРАТКА

У Мінску будуць больш актыўна прыцягваць грамадзян да ўдзелу ў фінансаванні работ па будаўніцтве парковак.

Дырэкцыі будаўніцтва Беларускай АЭС выдадзена ліцэнзія на ўзвядзенне ядзернай устаноўкі энергаблока нумар 1.

Мера стрымання адносна Уладзіслава Баўмгертнера не змянілася — ён застаецца пад дамашнім арыштам. Тэрмін расследавання крымінальнай справы адносна Баўмгертнера працягнуты на 2 месяцы.

Беларусь прадоўжыла забарону на вываз неапрацаваных шкур буйной рагатай жывёлы да 20 снежня.

У Мінску прышчэплена супраць грыпу 22,3 працэнта грамадзян, што склала 423 тыс. чалавек.

Мінскае гарадское ўпраўленне МНС 29 кастрычніка правядзе вучэнні ў будынку Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь па вуліцы Маскоўскай, 17. Вучэнні пройдуць з 10.00 да 12.00.

ЗІМОВЫ РАСКЛАД "БЕЛАВІЯ"

Рэкордных у айчыннай практыцы вынікаў дабілася ў гэтым годзе Нацыянальная авіякампанія "Белавія".

Колькасць перавезеных пасажыраў:

за суткі 9 571

за месяц больш як 200 тыс.

за 9 месяцаў 1 304,4 тыс.

Час дзеяння зімовага раскладу:

27 кастрычніка 2013 года - 29 сакавіка 2014 года

Новае ў зімовым раскладзе:

выкананне рэйсаў у Астану да 5 разоў у тыдзень

выкананне рэйсаў у Жэневу 3 разы ў тыдзень

выкананне рэйсаў у Тбілісі да 10 разоў у тыдзень

выкананне рэйсаў у Сочы 2 разы ў тыдзень*

У гэтым зімовым сезоне ў параўнанні з мінулагоднім будзе таксама павялічана частата рэйсаў з Мінска ў Ерэван, Калінінград, Кіеў, Маскву, Прагу, Рыгу, Стамбул і Франкфурт.

У перыяд навагодніх свят у Парыж і Барселону плануецца выканаць па 8 дадатковых рэйсаў, а ў Маскву, Прагу, Жэневу, Тбілісі, Баку, Ерэван, Рым, Мілан задзейнічаць паветраныя судны большай умяшчальнасці.

*У лютым напярэдадні і ў час правядзення зімовых Алімпійскіх гульняў колькасць палётаў у Сочы будзе павялічана да 3 разоў у тыдзень.

Крыніца: Нацыянальная авіякампанія "Белавія".

© Інфаграфіка БЕЛТА